**камсамольскае жыццё**



# З ВЫСОКАЙ ПАТРАБАВАЛЬНАСЦЮ

**Ад дысцыпліны, арганізаванасці кожнага, залежыць поспех у любой справе. На належным узроўні яны павінны быць і ў камсамольскіх арганізацыях універсітэта. Аб гэтым разважае ў сваім матэрыяле Г. Карасёва, сакратар камсамольскага бюро выкладчыкаў і супрацоўнікаў матфака.**

Як і ўвесь савецкі народ, моладзь краіны, настойліва працуе над ажыццяўленнем рашэнняў XXVI з'езда КПСС. лістападаўскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС. Умацаванне дысцыпліны — ключ да вырашэння многіх нашых праблем. Таму неабходна рабіць усё для таго, каб узорны парадак у нашым універсітэце стаў нормай жыцця.

Разам з тым у нас ёсць яшчэ такія камсамольскія арганізацыі, у якіх не створана абстаноўка нецярпімасці да парушальнікаў дысцыпліны. Не пастаўлена на належны ўзровень гэта работа і ў нашай камсамольскай арганізацыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў матэматычнага факультэта. За апошні час асабістая адказнасць за сваю працу і вынікі работы ўсяго калектыву ўзрасла, аднак ёсць яшчэ ў нас такія камсамольцы, для якіх спазненне на працу стала прывычнай нормай. А многія ж з іх звязаны з вучэбным працэсам. Студэнты бачаць такія адносіны да работы старэйшых камсамольцаў, а гэта, у сваю чаргу, адмоўна ўплывае і на студэнтаў, на ўзровень іх дысцыплінаванасці, а значыць, і на якасць ведаў.

Сёння высокія патрабаванні прад'яўляюцца да эфектыўнасці, якасці працы маладых работнікаў навукі і тэхнікі. Таму камітэты камсамола, саветы маладых вучоных павінны дабівацца таго, каб праца маладога інжынера, вучонага была творчай, а якасць навуковых даследаванняў адпавядала самым высокім патрабаванням.

Паспяховае вырашэнне задач, якія ставіць перад намі партыя, залежыць перш за ўсё ад глыбокага разумення кожным камсамольцам сэнсу і значэння барацьбы за ўмацаванне дысцыпліны, за арганізаванасць. Таму камсамольскаму бюро неабходна ўдзяліць асаблівую ўвагу ўзмацненню індывідуальнай выхаваўчай работы. Адной з самых эфектыўных і правераных форм выхавання моладзі з'яўляецца Ленінскі залік і грамадска-палітычная атэстацыя.

Прамежкавая грамадска-палітычная атэстацыя ўдзельнікаў Ленінскага заліку «Рашэнні XXVI з'езда КПСС — у жыццё!» ужо пачалася ў камсамольскіх групах універсітэта. Мы павінны з усёй адказнасцю аднесціся да гэтага мерапрыемства: уважліва заслухаць кожнага члена ВЛКСМ аб выкананні ім статутных патрабаванняў, аб вытворчай дзейнасці і ўдзеле ў грамадскім жыцці.

Працаздольнасць, настрой маладога інжынера, выкладчыка, а значыць і яго дысцыпліна, прадукцыйнасць працы залежаць ад таго, як ён праводзіць свой вольны час. У нашай камсамольскай арганізацыі вядзецца пэўная работа ў гэтым напрамку. Маладыя выкладчыкі і супрацоўнікі з'яўляюцца слухачамі народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання, прынялі ўдзел ва універсітэцкай спартакіядзе «Здароўе», разам выязджаюць адпачываць на турбазу «Сож».

Вынікі нашай работы будуць залежаць ад мэтанакіраванасці, арганізаванасці, поўнай самааддачы кожнага камсамольца, і ў першую чаргу, ад актыву. Мы павінны мабілізаваць усю сілу перакanання і камсамольскай патрабавальнасці на ўмацаванне працоўнай дысцыпліны, на барацьбу з любымі парушэннямі норм сацыялістычнага ладу жыцця.

**Г. КАРАСЕВА,**
**сакратар камсамольскага бюро выкладчыкаў і супрацоўнікаў матэматычнага факультэта.**

# НАВУКА—ВЫТВОРЧАСЦІ

**На мінулым тыдні ў нашым універсітэце на працягу трох дзён працаваў міжгаліновы Каардынацыйны Савет па праблеме «Лазерная тэхналогія». Адбылася творчая сустрэча вучоных Акадэміі навук БССР, Гомельскага дзяржаўнага універсітэта і Мазырскага педінстытут імя Н. К. Крупскай, прадстаўнікоў шэрагу саюзных міністэрстваў, прадпрыемстваў Гомеля.**

Удзельнікі Савета азнаёміліся з лабараторыямі кафедры оптыкі і пастаноўкай даследаванняў па фізіцы аптычных квантавых генератараў і нелінейнай оптыцы. На Савеце ішла размова аб навуковых дасягненнях, быў закрануты шэраг праблем. звязаных з патрэбамі вытворчасці і эфектыўным укараненнем распрацовак.

16 сакавіка на пленарным пасяджэнні выступілі рэктар ГДУ акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць, загадчыкі тэхналагічных аддзелаў В. М. Шамрын, У. С. Кандраценка, дэкан фізічнага факультэта У. Я. Мацюшэнка, загадчыкі лабараторый В. П. Волахаў, У. М. Старыкаў, У. С. Сакаленка загадчык кафедры оптыкі А .М. Сердзюкоў, старшыя навуковыя супрацоўнікі М. І. Аляшкевіч, А. Ц. Малашчанка і інш. Падпісаны доўгатэрміновы двухбаковы дагавор аб творчай садружнасці паміж ГДУ і супрацоўнічаючымі з ім прадпрыемствамі.

У рабоце Савета прыняў удзел загадчык аддзела навукі і навучальных устаноў Гомельскага абкома КПБ Б. М. Збароўскі.

Госці нашага універсітэта зрабілі экскурсію па Гомелю, азнаёміліся з яго памятнымі мясцінамі.

**С. ПАШУК,**
**намеснік загадчыка НДС ГДУ.**



**На здымку:** супрацоўнікі кафедры оптыкі пры рабоце на ўстаноўцы лазернай зваркі.

**Фота К. Дамітэркі.**

*Як жывеш, студэнцкая група?*

# ЗАЛЕЖЫЦЬ АД КОЖНАГА З НАС

Ужо больш паўгода займаемся мы ў ГДУ. Цяпер лічым сябе сапраўднымі студэнтамі, таму што вытрымалі першую экзаменацыйную сесію. Разумеем, што галоўнае для нас — гэта вучоба, але ж не толькі ёй жыве сённяшні студэнт. Мы паспелі прыгледзецца адзін да аднаго, пасябраваць, знайсці ўсім цікавыя справы па душы. Кожны камсамолец групы мае даручэнне, якое імкнецца выканаць заўсёды старанна і своечасова. А на сваім першым камсамольскім сходзе мы вырашылі прыняць калектыўны абавязак — стаць лектарамі. Складваюцца ў нашым невялікім калектыве і свае традыцыі: разам ходзім на мастацкія выстаўкі, якія адкрываюцца ў горадзе, потым дзелімся ўражаннямі ад убачанага на іх. Нашы самыя страсныя прыхільнікі мастацтва неаднаразова праводзілі ў групе цікавыя тэматычныя гутаркі. Большасць нашых рабят з'яўляецца слухачамі народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання.

Актыўны ўдзел мы прымаем і ва ўсіх факультэцкіх і універсітэцкіх мерапрыемствах. Прадстаўлялі свае работы на выстаўку навукова-тэхнічнай і мастацкай творчасці студэнтаў ГДУ, удзельнічалі ў днях братніх рэспублік, якія прысвячаліся 60-годдзю ўтварэння СССР. Цяпер актыўна рыхтуемся да факультэцкага свята — «Дзён біёлага».

У такім звычайным рытме ідзе наша студэнцкае жыццё. Ці будзе ў далейшым яно яшчэ больш цікавым, насычаным, залежыць **ад нас саміх.** Таму мы пастараемся рабіць усё дзеля таго, каб наша студэнцкая група Б-11 мацнела, набывала вопыт, а з цягам часу змагла стаць прыкладам для тых першакурснікаў, якія папоўняць студэнцкую сям'ю нашага біялагічнага факультэта.

**С. ЯРМАК,**
**камсорг групы Б-11 біяфака.**

*ВВК дзейнічае*

# СТРОГІМІ МЕРАМІ

**Ідуць заняткі другога семестра,** але ёсць яшчэ на эканамічным факультэце студэнты, якія не пераздалі запазычанасцей зімовай сесіі. Наогул, падведзеныя вынікі мінулай сесіі — не парадавалі. З 874 студэнтаў эканомфака 85 выдатнікаў вучобы і прыкладна столькі ж — 82 — непаспяваючых.

На пасяджэнні вучэбна-выхаваўчай камісіі факультэта ўскрываліся прычыны дрэннай паспяховасці студэнтаў, для «хваспістаў» назначаліся апошнія тэрміны пераздачы экзаменаў. Каб хутчэй ліквідоўваліся запазычанасці, створаны групы ўзаемадапамогі. Вынікі іх дзейнасці відавочныя: многія студэнты пазбавіліся «хвастоў». Але самымі «стойкімі» двоечнікамі, якія ніяк не могуць, ці можа не жадаюць пераздаць экзамены, застаюцца студэнты групы Т-32 А. Васілька, Р. Цуркан, А. Пагарцава, першакурсніца А. Дзігілева і В. Безбародаў з групы Т-33. На сваім нядаўнім пасяджэнні ВВК разам з членамі камітэта камсамола факультэта разглядалі персанальныя справы А. Васілька і В. Безбародава. Яны не здалі адпаведна 5 і 2 экзамены, маюць па 100 і 82 гадзіны пропускаў заняткаў без уважлівых прычын. На пасяджэнні было прынята рашэнне хадайнічаць перад дэканатам факультэта аб іх адлічэнні з універсітэта.

Члены вучэбна-выхаваўчай камісіі пастанавілі актывізаваць дзейнасць ВВК, больш увагі ўдзяляць падвядзенню вынікаў заліковых тыдняў, своечасова прымаць адпаведныя меры да непаспяваючых студэнтаў, парушальнікаў вучэбнай дысцыпліны, прымацаваць выдатнікаў да адстаючых.

**Актыўна** ўключылася ў работу рэйдавая брыгада, у якую ўваходзяць першакурснікі. Узначальвае яе Іна Фядуцік. На ўсіх курсах рэгулярна праводзяцца праверкі наведвання студэнтамі заняткаў. Вынікам гэтых праверак надаецца галоснасць. Тых, хто без уважлівых прычын прапусціў шэсць гадзін вучэбных заняткаў, заслухоўваюць члены рэйдавай брыгады. Самыя актыўная з іх — А. Шарова, Б. Клімовіч, М. Энцін.

У бліжэйшы час ВВК плануе абмен вопытам работы з такімі ж камісіямі на іншых факультэтах універсітэта, а таксама з вучэбна-выхаваўчымі камісіямі ВНУ рэспублікі, у прыватнасці, Беларускага політэхнічнага інстытута. Гэта яшчэ больш актывізуе і ўзмоцніць нашу работу па барацьбе з прагульшчыкамі і непаспяваючымі.

**Г. ТКАЧЭНКА,**
**старшыня ВВК эканамічнага факультэта, студэнтка 2-га курса.**

*Выпускнікі—першакурснікам*

# НА ТРЫВАЛАСЦЬ ВЕДАЎ

Не зусім звычайным быў калёквіум на першым курсе матэматычнага факультэта. Ролю выкладчыкаў-экзаменатараў узялі на сябе студэнты 5-га курса, якія праходзяць вытворчую практыку ў сценах універсітэта.

Матэматычны аналіз —адна з асноўных дысцыплін, якая вывучаецца на малодшых курсах. З яе асновамі знаёмяцца яшчэ ў школе. Нашай мэтай было праверыць веды першакурснікаў па тэме «Пераўтварэнне графікаў функцый», а разам з тым і падрыхтаваць іх да засваення новага матэрыялу, які будзе выкладаць кандыдат фізіка-матэматычных навук дацэнт І. М. Бруй.

Прымяненне тэхнічных сродкаў навучання дазволіла нам больш дакладна ацаніць веды студэнтаў, забяспечыць самастойнасць у выкананні задання. Аб выніках калёквіума гавораць наступныя лічбы: 28 працэнтаў першакурснікаў атрымалі адзнаку «выдатна», столькі ж — «добра», у 15 працэнтаў студэнтаў — здавальняючыя адзнакі. Аднак нямала было і такіх першакурснікаў, якія не з'явіліся на калёквіум ні ў першы раз, ні на паўторную яго пераздачу. У чым прычына? Можа ў недастатковай саліднасці экзаменатараў? Нам думаецца, проста ў безадказных адносінах правяраемых да вучобы.

У цэлым жа праведзены калёквіум пакінуў добрае ўражанне аб школьнай матэматычнай падрыхтоўцы першакурснікаў. Студэнты В. Буракоўскі, В. Аніськоў, А. Фрыдман, В. Шалабасава, А. Базылёва, Р. Мазур, А. Чарнякоў, Ю. Надольскі і іншыя хутка і беспамылкова справіліся з заданнем.

Хочацца пажадаць нашым першакурснікам, каб захапленне матэматыкай перарасло ў сапраўдную любоў да яе.

**А. СЕХІНА,**
**С. ЯНЕЛЬ,**
**студэнткі 5-га курса матэматычнага факультэта.**

*Па слядах крытычных сігналаў*

# НЕДАХОПЫ ЎХІЛЯЮЦЦА

**У нашай газеце за 19 лютага і 5 сакавіка г. г. былі надрукаваны матэрыялы пад загалоўкамі «Узмацніць патрабавальнасць» і «Ні аператыўнасці, ні баявітасці». У першым з іх ішла размова аб фактах парушэння працоўнай і вучэбнай дысцыпліны, у другім — аб паслабленні работы насценнага друку. У абедзвюх публікацыях разам з іншымі крытыкаваўся і геалагічны факультэт.**

**Як паведаміла сакратар партыйнага бюро геалагічнага факультэта Ж. А. Герасімава, на факультэце прыняты канкрэтныя меры для недапушчэння пропуску студэнтамі заняткаў без уважлівых прычын. На курсах праведзены гутаркі аб усямерным умацаванні працоўнай, вучэбнай і выканаўчай дысцыпліны. Наведваемасць студэнтамі лекцыйных і практычных заняткаў палепшылася. Пропускі іх без уважлівых прычын практычна не дапускаюцца.**

**Якасна палепшаны рэдакцыйны састаў насценнай газеты «Геолаг». Яна пачала выходзіць рэгулярна. Пастаўлена задача зрабіць факультэцкую насценгазету змястоўнай і цікавай, сапраўды баявым органам партыйнай, камсамольскай і прафсаюзнай арганізацый, дэканата гефака.**

